Летась у Беларусі зроблена 491 аперацыя па трансплантацыі органаў

ДЗЕЛЯ ВЫРАТАВАННЯ ЖЫЦЦЯ

Найчасцей перасаджвалі ныркі — такіх трансплантацый было 362.

Акрамя гэтага, 79 пацыентам перасаджана печань, 39 — сэрца, 6 — падстраўнікавая залоза, 5 — лёгкія. Амаль палова аперацый — 179 — праведзена ў рэгіёнах. Ад 35 да 45 трансплантацый ажыццявілі ў Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцях. А ў пачатку гэтага года першую аперацыю па трансплантацыі ныркі зрабілі магілёўскія ўрачы.

Сёння Беларусь, — дарэчы, адзіная ў СНД, — уваходзіць у топ-50 самых развітых краін свету ў галіне транспланталогіі. Па ўзроўні донарства органаў мы знаходзімся ў топ-20.

— Новым пунктам адліку ў гісторыі беларускай транспланталогіі стаў 2008 год, калі 3 красавіка была праведзена першая ў Беларусі аперацыя па перасадцы печані, — кажа **кіраўнік РНПЦ трансплантацыі органаў і тканак доктар медыцынскіх навук Алег РУМО.** — З таго часу колькасць выкананых трансплантацый павялічылася больш чым у 65 разоў, а колькасць донараў выросла ў 45 разоў. У 2011 годзе Беларусь увайшла ў топ-50 самых развітых у гэтай галіне медыцыны краін.

Алег Румо падкрэсліў, што з мінулага года ў Беларусі дзейнічае камп'ютарная праграма па размеркаванні донарскіх органаў, якая дазваляе выключыць так званы чалавечы фактар падчас самай распаўсюджанай аперацыі па трансплантацыі — перасадкі ныркі. Камп'ютар падбірае кандыдатаў на орган з ліста чакання, кіруючыся двума прынцыпамі: прыярытэтнасці і клінічнай эфектыўнасці. Першы з іх азначае, што перавага аддаецца дзецям і тым, хто мае патрэбу ў перасадцы некалькіх органаў. Другі ўлічвае працягласць функцыянавання органа.

Дарэчы, у Беларусі ўжо каля дзвюх соцень дзяцей, якім выканалі перасадку органаў, 120 з іх зроблены трансплантацыі ныркі, 65 — печані і 2 — сэрца. А 34 жанчыны з трансплантаванымі органамі нарадзілі здаровых дзяцей.

Сёння Беларусь, — дарэчы, адзіная ў СНД, — уваходзіць у топ-50 самых развітых краін свету ў галіне транспланталогіі. Па ўзроўні донарства органаў мы знаходзімся ў топ-20.

Летась наша краіна далучылася да міжнароднага згуртавання па абмене органамі Foedus. Гэта арганізацыя аб'ядноўвае значную колькасць краін Еўропы з агульным лікам насельніцтва звыш 300 мільёнаў чалавек. Паміж імі ажыццяўляецца ўзаемавыгадны бязвыплатны абмен органамі ў тым выпадку, калі ў якойсьці з гэтых краін тэрмінова патрабуецца трансплантацыя.

— Калі ў краіне ёсць пацыент з тэрмінальнай стадыяй захворвання печані, а донарскага органа на гэты момант няма, можна звярнуцца ў арганізацыю і атрымаць яго з суседняй краіны, — растлумачыў Алег Румо. — У 2017-м у межах такога абмену паміж краінамі Foedus было трансплантавана 54 органы. Летась мы таксама сутыкнуліся з вялікай праблемай: тэрміновая трансплантацыя печані патрабавалася некалькім пацыентам, якія атруціліся грыбамі. Чатыры аперацыі мы правялі паспяхова. А вось выратаваць адну з пацыентак, маці пяцярых дзяцей, на жаль, не ўдалося. Трансплантацыю выканалі, але галаўны мозг да таго часу загінуў. Вось у такіх сітуацыях, калі адбылося атручванне невядомымі ядамі, міжнароднае супрацоўніцтва мае вялікае значэнне.

Сёлета плануецца разгледзець пытанне аб міжнародным супрацоўніцтве на заканадаўчым узроўні і ўнесці адпаведныя змены ў нарматыўныя акты. А таксама пашырыць спіс прыжыццёвых донараў. Калі раней іх колькасць абмяжоўвалася донарамі «першай рукі», а менавіта роднымі братамі, сёстрамі, дзецьмі, бацькамі, то цяпер добраахвотна ахвяраваць свой орган могуць і больш далёкія сваякі. Таксама парламентарыі разгледзяць і магчымасць бязвыплатнага дарэння органаў (такая практыка існуе ў многіх краінах свету), калі чалавек гатовы ахвяраваць частку сваёй печані ці нырку, не ведаючы, каму ён яе «адрасуе».

Даведка

Першая аперацыя па трансплантацыі на тэрыторыі Беларусі была зроблена 48 гадоў таму. З той пары перасаджана больш за 4 тысячы органаў. Прычым у першыя чатыры дзесяцігоддзі развіцця транспланталогіі адбылося ўсяго 700 аперацый. А за апошнія дзесяцігоддзе перасаджана 3300 органаў.

Па дапамогу ў перасадцы органаў да беларускіх медыкаў звяртаюцца і замежнікі. Найчасцей гэта грамадзяне суседняй Украіны. Органы для іх бясплатныя, а вось работу трансплантолагаў яны аплачваюць. Аперацыя па перасадцы ныркі каштуе ў нас каля 67 тысяч долараў, печані — 132, сэрца — ад 100 тысяч. Для параўнання: у Індыі, дзе больш за ўсё робіцца трансплантацый, перасадка ныркі каштуе ад 36 да 57 тысяч долараў. Такім чынам, як адзначыў Алег Румо, нашы цэны параўнальна невысокія.

Аднак платныя трансплантацыі пакуль не перавышаюць 10 %, паводле інфармацыі Алега Румо, паколькі перасадка патрабуецца немалой колькасці сваіх грамадзян. У лісце чакання на перасадку ныркі, напрыклад, знаходзяцца 324 беларусы, печані — 116, сэрца — 58.

— Усе выпадкі рознай ступені цяжкасці, — кажа медык. — І калі стан кагосьці рэзка пагоршыцца і будзе пагроза жыццю, ён апярэдзіць астатніх у чарзе, аперацыя робіцца тэрмінова. Гэтым летам малады чалавек, які выхоўваў дваіх дзетак і не знаходзіўся ў лісце чакання на перасадку печані, атруціўшыся грыбамі, стаў першым у чарзе. Яго ўдалося выратаваць.

Сала ці шакалад?

Якія прадукты выклікаюць вугрысты сып

З-за чаго на самай справе з'яўляюцца прышчы ў падлеткаў і дарослых? І як пазбавіцца ад гэтых чырвоных кропак раз і назаўсёды?

Мы лічым, што вугрысты сып сустракаецца толькі ў падлеткаў, але гэта міф. На самай справе ён атакуе кожнага пятага дарослага. На якія праблемы намякаюць гэтыя сузор'і і як іх сцерці з твару і цела?

Вугры ў падлеткаў узнікаюць у выніку гарманальнай перабудовы. Арганізмы і дзяўчатак, і хлопчыкаў пачынаюць актыўна выпрацоўваць тэстастэрон, што вядзе да павышанай выпрацоўкі скуранога тлушчу, які закрывае поры. У дарослых людзей такія «закаркоўкі» адбываюцца таму, што ў іх лёгка трапляюць бруд і пыл. А яшчэ дарослыя больш часта ўмываюцца — так мы сушым скуру, і сальныя залозы імкнуцца гэта выправіць. Аднак сценкі праходаў з часам становяцца няроўнымі і падчас інтэнсіўнай работы забіваюцца.

Многія ведаюць, што выціскаць прышчы нельга. Калі мы выціскаем прышчык, то адкрываем праход у свой арганізм для любой інфекцыі. Можна абмежавацца фурункулам, а можна атрымаць заражэнне крыві. Нельга датыкацца да вугроў на твары. Ёсць так званы мёртвы трыкутнік: вобласць носа, верхняй губы і падбародка, дзе выціскаць прышчы асабліва небяспечна.

На выпрацоўку скуранога тлушчу ўплываюць нашы харчовыя звычкі. Аднак гэта зусім не тлустая ежа, а шакалад, алкаголь, газіраваныя напоі, ласункі. Гэтыя прадукты паскараюць кровазварот, што і ўзмацняе работу сальных залоз. Інакш кажучы, яны прымушаюць нас пацець, а да поту прыліпае бруд і забівае поры.

■ Дарослыя — дзеці

ДАЦЬ ПАЧУЦЦЁ АБАРОНЕНАСЦІ

Якія памылкі робяць бацькі ў выхаванні падлеткаў

Выхаванне падлетка — складаная задача, і большасць бацькоў з году ў год сутыкаецца з вялікімі цяжкасцямі. Колькасць падлеткавых самагубстваў значна выросла і стала другой па велічыні прычынай смяротнасці ва ўзросце ад 14 да 20 гадоў. Сур'ёзна павысіўся ўзровень падлеткавых злачыннасці і цяжарнасці, наркаманіі і заражэння хваробамі, якія перадаюцца палавым шляхам. У чым прычыны такіх радыкальных змен?

Адна з іх — непадрыхтаванасць бацькоў і адсутнасць у іх разумення таго, як трэба кантактаваць з падлеткамі, лічыць **псіхолаг Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера г. Мінска Вольга ХВЯЖЭНКА.** Частка бацькоў не зусім правільна разумее, што такое падлеткавы перыяд і якія спадзяванні трэба ўскладаць на сваіх дзяцей.

— Падлетак — гэта дзіця, якое знаходзіцца на шляху да дарослага жыцця, — кажа Вольга Хвяжэнка. — Гэта пакуль яшчэ не дзяўчына ці юнак, і ўсе патрэбнасці застаюцца дзіцячымі. Самая распаўсюджаная памылка — гэта тое, што ўсе навакольныя лічаць падлетка дарослым і патрабуюць адпаведнай адказнасці за ўчынкі.

Падлеткам, як і ўсім дзецям, неабходна ведаць і адчуваць, што іх любяць і прымаюць такімі, якія яны ёсць, што пра іх клапоцяцца, што блізкія да іх неабыякавыя. Падлетак можа быць высокага росту і больш моцным за сваіх бацькоў, але эмацыянальна застаецца дзіцем. Калі ён не мае бясспрэчных доказаў бацькоўскай любові, ён перастае імкнуцца рэалізаваць свае лепшыя якасці.

Выхоўваць падлетка складана яшчэ і таму, што ён большую частку часу праводзіць пад уплывам іншых: настаўнікаў, равеснікаў, суседзяў, прадстаўнікоў масавай культуры. Але трэба памятаць, што толькі сям'я можа стварыць для яго атмасферу душэўнага камфорту, абароненасці, упэўненасці ў сабе, навучыць яго правільна ставіцца да старэйшых, равеснікаў, маленькіх дзяцей, карэктна паводзіць сябе ў нестандартных сітуацыях.

Часта ў наш час адбываецца тое, што называецца зменай роляў. Бацькі чакаюць ад дзяцей запаўнення свайго эмацыянальнага вакууму — недахопу шчырага і цёплага кантактавання. Гэта можа здарыцца ў любой сям'і, але найчасцей характэрна для няпоўных. Некаторыя бацькі-адзіночкі ўстанаўліваюць з дзецьмі-падлеткамі даверлівыя адносіны, падобныя на тыя, якія бываюць паміж дарослымі сябрамі ці калегамі. Прычынай таму служыць адсутнасць суразмоўніка, з якім можна падзяліцца сваімі дарослымі праблемамі. Такія бацькі скардзяцца падлетку на сваё пачуццё адзіноты, прыгнечанасці ці несправядлівага стаўлення ў дачыненні да сябе з боку навакольных. Так яны перастаюць выконваць сваю ролю, бо менавіта бацькі павінны задавольваць псіхалагічныя патрэбы падлетка, а не наадварот. Бацькі павінны ў любых жыццёвых абставінах заставацца апорай і падтрымкай для падлетка — гэта натуральны ход падзей. Таму падтрымку для сябе трэба шукаць дзе пажадаеце, але не ў дзецях.

Можна спытаць меркаванне падлетка ці параду, але не для таго, каб перакласці прыняцце рашэння ці займець іх эмацыянальную падтрымку. Нельга патрабаваць ад іх дапамогі ў аблягчэнні пакут. Гэтак сама нельга быць пастаянна строгімі з імі, асабліва калі існуе псіхалагічная залежнасць ад іх.

Найпершы бацькоўскі абавязак заключаецца ў тым, каб падлетак адчуваў сябе пяшчотна любімым. А ў працэсе выхавання важна заставацца для яго аўтарытэтам і надзейнай апорай

Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.